УДК 930.1 (476) «1917/1918»

М. Я. Сяменчык, праф., д-р гіст. навук, заг. кафедры (БДТУ, г. Мінск)

# САВЕТЫ РАБОЧЫХ, САЛДАЦКІХ І СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСІ (САКАВІК 1917 – САКАВІК 1918 гг.) У АСВЯТЛЕННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Вывучэнне і асвятленне дзейнасці Саветаў праходзіла ў 4 этапы. На першым з іх – у 1920-х – пачатку 1930-х гг. аўтарамі публікацый з’яўляліся бальшавікі Віцебска, Мінска, Гомеля, Магілёва, Мазыра, Оршы [1]. Другі этап вывучэння Саветаў меў месца з канца 1930-х да другой паловы 1950-х гадоў [2]. З асуджэннем сталінізму пачаўся трэці этап. Яго буйнейшым творам зрабілася калектыўная манаграфія «Победа Советской власти в Белоруссии» [3]. У 1987 г. выйшла ў свет манаграфія П. Башко, прысвечаная Саветам Беларусі [4]. Істотнай заслугай аўтара з’яўляецца падрабязны падлік і класіфікацыя ўсіх Саветаў і характарыстыка Часовага ўрада, эсэраў, меншавікоў, бундаўцаў, нацыяналістаў. З пачатку 1990-х гадоў бярэ адлік чацвёрты этап вывучэння гісторыі Саветаў з уласцівымі яму зменамі навуковых парадыгм, адмовы ад ідэалагем «Краткого курса» і марксісцка-ленінскай метадалогіі. М. Сяменчыку ў ліку першых ўдалося апублікаваць аб’ектыўныя, сапраўды навуковыя матэрыялы аб гісторыі Саветаў Беларусі азначанага перыяду [5].

ЛІТАРАТУРА

1 Красная быль: Большевики в Витебске. Сб. ст., воспоминаний и материалов. Витебск: 1923. – 220 с.;Кастрычнік на Беларусі. Зб. арты-кулаў і дакумэнтаў / Улажыў С. Агурскі. Менск: ДВБ, 1927. – 488 с.;

2 Папоў, Ф. О. Дзейнасць М. В. Фрунзе ў Беларусі ў перыяд падрыхтоўкі Вялікай Кас-трычніцкай соцыялітычнай рэволюцыі / Ф. О. Папоў. – Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Рэдакцыя палітычнай літаратуры, 1951. – 132 с.; Гапоненко, Л. Солдатские масы Западного фронта в борьбе за власть Советов (1917) /Л. Гапоненко. – М.: Государственное издательство политической литературы, 1953. – 196 с.

3 Победа Советской власти в Белоруссии. Минск.: Наука и техника, 1967. – 508 с.

4 Башко, П. С. Советы рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белоруссии (март – октябрь 1917 г.) / Под ред. И. М. Игнатенко. – Мн.: Наука и техника, 1987. – 254 с.

5 Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): у 2 ч. / М. Я. Сяменчык. – Мінск: БДПУ, 2001. – Ч. I. – 200 с.; Ч. II. – 160 с.